# СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫ РАБОТЫ З МУЗЕЙНАЙ АЎДЫТОРЫЯЙ (з вопыту работы філіяла «Беларуская хатка» Літаратурнага музея Максіма Багдановіча)

**Т. А. Лабада,** *загадчык філіяла «Беларуская хатка» Літаратурнага музея Максіма Багдановіча*

Апошнім часам у музейным асяроддзі ўсё часцей пачынаюць звяртацца да інтэрактыўных форм работы з наведвальнікам. Гэтага вымагае сама музейная аўдыторыя, якая становіцца ўсё больш патрабавальнай. Сучасным наведвальнікам музеяў вельмі часта ўжо не хапае экскурсавода, які проста размаўляе і паказвае то направа, то налева… Сёння музейны супрацоўнік павінен знайсці такую форму работы, з дапамогай якой наведвальнік зможа не проста ўспрыняць матэрыял, а і адгукнуцца на яго. Сучасная класічная музейная педагогіка прапануе некалькі розных кірункаў. Сярод іх як экскурсіі, так і фільмы, камп'ютар, мультымедыйная прэзентацыя, майстэрні, кааперацыі са школамі, музейны тэатр, месцы для чытання і інш. На жаль, айчынная музейна-педагагічная дзейнасць шмат у чым саступае дзейнасці калегам, напрыклад, Германіі. Для літаратурных музеяў інтэрактыўныя формы дзейнасці з наведвальнікам толькі пачалі ўкараняцца, вельмі марудна саступаючы месца маналагічнай экскурсіі.

На сёння музейная педагогіка ўключае не толькі класічную музейную педагогіку, архітэктуру і выставачнае афармленне, дызайн, але і сэрвіс для наведвальнікаў. Калі класічная музейная педагогіка ў асноўным залежыць ад саміх супрацоўнікаў музеяў, ад іх вопыту і ідэй, то для якаснага вырашэння гэтых ідэй, а потым і паспяховага выкарыстання, якое б пачало прыносіць прыбытак, неабходна дастатковая колькасць фінансавых сродкаў.

Зараз музей, у прыватнасці філіял «Беларуская хатка» Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, выкарыстоўвае, і даволі паспяхова, наступныя формы работы: тэатралізаваныя прадстаўленні старажытнага лялечнага тэатра батлейка, педагагічныя заняткі «Сам зраблю батлеечную ляльку», «Душа “Беларускай хаткі”», “Калядкі ў “Беларускай хатцы”», сумесныя музейна-школьныя праекты, а таксама праводзіць шэраг сустрэч з навукоўцамі і творчымі асобамі, у тым ліку з прымяненнем тэатралізаваных формаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўным стрыжнем пры стварэнні філіяла «Беларуская хатка» Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, самай першай нетрадыцыйнай формай працы з музейнай аўдыторыяй, якая на час свайго ўзнікнення была наватарскай, стала ідэя зрабіць своеасаблівую літаратурную гасцёўню, дзе можна было б працягнуць традыцыі клуба інтэлігенцыі «Беларуская хатка», што існаваў у Мінску ў 16–20-х гг. XX ст., удзельнікам якога быў таксама і Максім Багдановіч. Вядома і тое, што на Каляды 1915 г. у Беларускай кнігарні былі наладжаны прадстаўленні старажытнага лялечнага тэатра і Максім Багдановіч марыў павандраваць з батлейкай па Беларусі. Таму мастацкая канцэпцыя, распрацаваная заслужаным работнікам культуры Беларусі Эдуардам Агуновічам, прадугледжвала стварэнне своеасаблівай тэатральнай залы са сцэнай і копіяй старажытнай магілёўскай батлейкі XIX ст. Філіял «Беларуская хатка» першым у музейным асяроддзі адрадзіў паказ батлейкі. Спектаклі старажытнага лялечнага тэатра паказваюцца з лета 1991 г. У яго рэпертуары як рэлігійныя, так і свецкія інтэрмедыі на розныя бытавыя тэмы. Тэксты ў свой час былі адабраны і адаптаваны супрацоўнікамі музея С. Вітушкам і Э. Акулінымі. І да сёння прадстаўленні працягваюць ўзбагачацца традыцыйнымі інтэрмедыямі. Падрыхтаваны і іншыя спектаклі па матывах вершаў беларускіх паэтаў, а таксама беларускіх казак. Экскурсіі з элементам тэатралізацыі (супрацоўнікі пераапраналіся ў народныя строі і igralі на скрыпцы) і батлеечныя прадстаўленні сталі яскравай карцінай таго, як дзеці бачаць экспанаты не самі па сабе, а ў кантэксце. Народжаныя незабыўныя перажыванні ў душы дзіцяці не губляюцца. Ідзе ўзаемны дыялог: дзеці пасля наведвання музея робяць малюнкі, дзе фіксуюць рэчы, якія іх найбольш уразілі. Лялечны тэатр батлейка, да ўсяго іншага, дазваляе гледачам не проста бачыць, але і станавіцца як бы ўдзельнікамі таго дзеяння, бо батлейшчык праз герояў інтэрмедый заводзіць размову і з імі, ненавязліва прымушае адгукацца.

Працягваючы тэму старажытнага лялечнага тэатра, трэба адзначыць і цыкл музейных заняткаў «Сам зраблю батлеечную ляльку». На жаль, музейная плошча не прыдатная для правядзення заняткаў на базе філіяла, але супрацоўнікі знайшлі выйсце, выязджаючы ў школы. Адмоўнае тут тое, што па-за сценамі музея ўсё ж такі губляецца тая чароўная атмасфера, якая павінна ўздзейнічаць на эмоцыі наведвальніка. Але выкарыстоўваючы музейныя прадметы, мультымедыйную прэзентацыю, музейны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супрацоўнік дасягае канчатковай мэты: аўдыторыя жыва рэагуе. Дзеці вырабляюць ляльку, выкарыстоўваючы самыя даступныя на сёння матэрыялы: кардон і палачкі (кактэйлевую саломку). Падчас заняткаў яны не толькі ствараюць ляльку, але і даведваюцца пра гісторыю старажытнага лялечнага тэатра, яго разнавіднасці; разыгрываючы міні-сцэнку, разважаюць на тэму, «як выратаваць батлейку ад ураднікаў», а таксама спрабуюць сябе ў якасці батлейшчыкаў.

Элементы батлеечных прадстаўленняў уключаны і ў занятак «Калядкі ў “Беларускай хатцы”». Гэтае забаўляльнае відовішча разлічана на знаёмства дзяцей з беларускім фальклорам і традыцыямі.

Музейны занятак «Душа “Беларускай хаткі”» – для тых, хто ўпершыню прыходзіць у музей. Дзеці знаёмяцца з паняццямі «музей», «мемарыяльны музей». На занятках выхоўваецца ўменне правільна паводзіць сябе ў музеі, беражліва ставіцца да культурных здабыткаў нашага народа.

Сярод сумесных мерапрыемстваў з навучальнымі ўстановамі − літаратурная гасцёўня «Па старонках сямейнага альбома Багдановічаў», наладжаная са школьнікамі сярэдняй школы № 3 (на базе школы), віктарына-конкурс «Дарогамі Максіма» (у музеі) і інш. На такіх мерапрыемствах частку праграмы рыхтуюць самі дзеці: інсцэніроўкі, абарона назвы каманды і інш. Яны рыхтуюцца загадзя, звычайна пасля наведвання экскурсіі, потым кожная каманда прадстаўляе сваё выступленне, але кіруе працэсам менавіта музейны супрацоўнік.

Даволі цікавая работа вядзецца з дарослымі. З 1992 па 2008 г. можна вызначыць некалькі такіх форм работы: вечары-лекцыі, літаратурныя, музычныя і музычна-літаратурныя імпрэзы, вечары памяці і інш.

Асобна трэба адзначыць літаратурна-тэатралізаваныя мерапрыемствы. Удзельнікамі імпрэз з’яўляліся студэнты, аспіранты БДУ культуры і мастацтва, супрацоўнікі і сябры Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Гэта своеасаблівы працяг дзейнасці аднайменнага клуба інтэлігенцыі пачатку XX ст. Нездарма менавіта там працавалі ў свой час Першае беларускае таварыства драмы і камедыі, драматычная секцыя Беларускай тэатральнай грамады, хор пад кіраўніцтвам У. Тэраўскага і іншыя аматарскія калектывы. Задума ўвасобіць вопыт нашых папярэднікаў, якія стаялі на чале

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэння прафесійнага тэатра, дала пэўны плён: аматарскія тэатральныя замалёўкі сталі добрым ілюстрацыйным матэрыялам, які ажыўляе любое мерапрыемства, дапамагае вобразнаму ўяўленню гледача і госця вечара, тым самым недакучліва спрыяе адукацыйнаму працэсу. Сярод такіх мерапрыемстваў – вечар, прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння А. Я. Багдановіча, вечары-прэзентацыі кніг І.Багдановіч «Авангард і традыцыя», «Феномен Максіма Багдановіча», «Сармацкі альбом», «Прыватныя рымляне», гістарычнай драмы Л.Рублеўскай і В.Скалабана «Людвіка і Фабіян», калекцыі народных строяў Л.Мятлеўскай «Суладнасць песні, музыкі і строяў», вечар да Дня закаханых з суполкай «Літаратурнае прадмесце», «Дзень закаханых Максіма і Веранікі» і інш.

Можна вылучыць таксама вечары-ўрокі танцаў «Беларускі народны танец: гісторыя і сучаснасць» і «Музыка 30-х гадоў: Смаргонь – Вілейка – Крэва», дзе наведвальнікі мелі магчымасць не толькі пачуць аўтэнтычную ігру і пабачыць, як танцавалі мазурку, падэспань і польку, але і самім паспрабаваць навучыцца гэтым танцам.

Цікавыя з пункту гледжання інтэрактыву цыклы фальклорных вечароў «Беларускі народны каляндар» і «З крыніц спрадвечных: гартаючы старонкі беларускага народнага календара». Гэта не толькі знаёмства з народнымі святамі і абрадамі, з традыцыйнымі стравамі, пра якія распавядалі вядомыя фалькларысты, але і жывое судакрананне з аўтэнтычнымі спевамі і ігрой на музычных інструментах.

Характарызуе ўсе гэтыя мерапрыемствы тое, што глядач на іх не пасіўны, а раўнапраўны ўдзельнік. Ён уключаны ў інтэрактыўны працэс. Таму музейныя супрацоўнікі зацікаўлены менавіта ў такой падачы матэрыялу, бо ўпэўнены: на гэтыя праекты аўдыторыя прыйдзе. Мы шчыра спадзяёмся, што такія формы работы стануць для людзей адкрыццём свету як Максіма Багдановіча, так і беларускай літаратуры, нацыянальных традыцый, культуры, прычым не толькі мінулых, але і сучасных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ